# Умельцы





Прыемна назіраць за работай вучняў Баханоўскай сярэдняй школы, якія рабілі штыкетнік для калгаса. Стараліся ўсе хлопцы, а самыя спрытныя забівалі цвікі з двух, а то і аднаго ўдару. Самае галоўнае, што рабілі яны гэту работу самастойна, з вялікай ахвотай. Упэўнена, што з гэтых хлопцаў вырастуць сапраўдныя гаспадары. А якія прыгожыя, з выразной спінкай табурэткі робяць хлопцы для рэалізацыі мясцоваму насельніцтву! Зараз рабяты практыкуюцца на вырабах вешалак для адзення.

Гэту вялікую працоўную загартоўку вучні атрымліваюць, дзякуючы нястомнай рабоце настаўніка працы мясцовай школы Міхаіла Міхайлавіча Луцаева.

На здымках: вучні Баханоўскай школы за вырабам штыкетніка для калгаса; Андрэй Рабцаў, Генадзь Камкоў са зробленымі ўласнымі рукамі табурэткамі.

С. БАБРОВА.
Фота аўтара.

**Баброва, С.** Умельцы / С. Баброва ; фота аўтара // Шлях Кастрычніка. — 1991. — 18 кастрычніка. — С. 2.
*Вучні Бахаsucceedанаўскай сярэдняй школы,  пад кіраўніцтвам настаўніка працы, робяць штыкетнік для калгаса.*